**ДЗЯРЖАЎНЫ КАМІТЭТ
ПА МАЕМАСЦІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

зав. Чырваназоркавы, 12, 220005, г. Мінск
тэл./факс (017) 2882725,
e-mail: info@gki.gov.by

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ
ПО ИМУЩЕСТВУ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

пер. Краснозвёздный, 12, 220005, г. Минск
тел./факс (017) 2882725,
e-mail: info@gki.gov.by

23.12.2022 № 3-6/963-кол
На №________ от____________

Адказ на звароты грамадзян па пытанні транслітарацыі найменняў геаграфічных аб’ектаў літарамі лацінскага алфавіта

*Размешчаны на афіцыйным сайце Дзяржаўнага камітэта па маёмасці ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт на падставе пункта 7 артыкула 25 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З ”Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб“*

Дзяржаўны камітэт па маёмасці (далей – Дзяржкаммаёмасць) у межах кампетэнцыі разгледзеў электронныя звароты грамадзян па пытанні транслітарацыі найменняў геаграфічных аб’ектаў літарамі лацінскага алфавіта і паведамляе наступнае.

На падставе абзаца пятага артыкула 9 Закона Рэспублікі Беларусь ад 16 лістапада 2010 г. № 190-З ”Аб найменнях геаграфічных аб’ектаў“ Дзяржкаммаёмасць вызначае правілы транслітарацыі найменняў геаграфічных аб’ектаў літарамі лацінскага алфавіта.

Названыя правілы выкладзены ў Інструкцыі па транслітарацыі геаграфічных назваў Рэспублікі Беларусь літарамі лацінскага алфавіта, зацверджанай пастановай Дзяржаўнага камітэта па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі Рэспублікі Беларусь ад 23 лістапада 2000 г. № 15 (далей – Інструкцыя). Згодна з пунктам 1 Інструкцыі сфера яе дзеяння абмежавана перадачай геаграфічных назваў з беларускай формы напісання на лацініцу толькі пры стварэнні ў Рэспубліцы Беларусь на замежных мовах картаграфічных і іншых твораў, прызначаных для міжнароднага карыстання.

Такім чынам, надпісы з найменнямі геаграфічных аб’ектаў у картаграфічных выданнях рэспублікі, прызначаных для замежных карыстальнікаў, выкананы ў адпаведнасці з нормамі Інструкцыі.

Згодна з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З ”Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб“ адказ Дзяржкаммаёмасці на зварот можа быць абскарджаны ў суд у парадку, які ўстаноўлены заканадаўствам.

Старшыня камітэта Д.Ф.Матусевіч

Бародзіч І.У. 2848078